вышкі. Захаваліся 2 курганы дыям. 6 м, выш. 1,5 м. У 1970 З.М.Сяргеева даследавала 5 насыпаў. Пахавальны абрад — трупапалажэнне ў дамавіне. У жаночых пахаваннях знойдзена 39 цыліндрычных і бочачкападобных залочаных шкляных пацерак, 2 сярэбраныя пласціністыя і 1 драцяны пярсцёнкі. Датуецца 11 ст.

Могільнік-2 за 0,5 км на Пн ад могільніка-1, у лесе. Складаецца з 2 груп курганоў (у 1-й — 13 насыпаў, у 2-й — 24), размешчаных на адлегласці 50 м адна ад адной. Насыпы круглыя, дыям. 7—9 м, выш. 1,7—1,8 м. Адкрыў у 1975 Д.З.Васілеўскі, абследавалі ў 1959 Л.В.Аляксееў, у 1972 А.Р.Мітрафанаў. У 1987 В.М.Ляўко поўнасцю даследавала першую групу курганоў. Пахавальныя абрады — трупаспаленне, трупапалажэнне галавой на З і пераходны (частковае трупаспаленне на гарызонце ці ў насыпе). У адным кургане рэштак пахавання не выяўлена. У 2 курганах зафіксавана ўпушчанае ў насып дадатковае трупаспаленне і парнае трупапалажэнне мужчыны і жанчыны на гарызонце, у адным — трупаспаленне ў драўлянай скрыні. Знойдзены фрагменты кругавой пасуды з лінейным або хвалістым арнаментам, жалезная дужка і 3 абручы ад драўлянага вядра, нажы. У ліку жаночых упрыгажэнняў шкляныя, чорныя каралавыя, сердалікавыя, з пясчаніку і адна з бірузовага фаянсу пацеркі. Знойдзены сярэбраныя і бронзавыя падковападобныя фібулы, пярсцёнкі, скроневыя кольцы, віты бронзавы бранзалет з завязанымі канцамі, жалезная падковападобная фібула. У 2 курганах вылучаюцца мужчынскія пахаванні па абраду трупапалажэння на падсыпцы з рэчамі. У адным з іх жалезны нож, сякера, крэсіва з крэменем, у падсыпцы над пахаваннем былі зафіксаваны рэшткі памінальнага вогнішча, у якім знойдзены ключ, 2 жалезныя спражкі, 2 крэсівы, бронзавы рыбалоўны кручок. У другім пахаванні знойдзены набор вагавых гірак, у вогнішчы — вагавыя шалі. Датуецца 2-й пал. 10 — 1-й пал. 11 ст.



*Упрыгажэнні крывічоў з курганнага могільніка Дроздава.*

*Літ.:* Левко О.Н. Средневековые погребальные памятники Оршанского Поднепровья // Час, помнікі, людзі. Памяці рэпрэсаваных археолагаў: тэз. дакладаў Міжнар. канф. Мінск, 1993.

*В.М.Ляўко.*

**ДРУ́ГАСНЫ ФАЛЬКЛО́Р**, форма ўзнаўлення народнай песеннай спадчыны ў маст. практыцы; адзін з тыпаў фалькларызму ў маст. творчасці. Вызначальная асаблівасць Д.ф. у тым, што яго выканаўцы не з'яўляюцца носьбітамі традыцый. Звычайна гэта маладыя людзі, якія неабыякава ставяцца да лёсу нар. песні, жадаюць так спяваць, танцаваць, іграць на нар. інструментах, узнаўляць абрадавыя дзеі, як яны існуюць у натуральным побыце. З гэтай мэтай яны наладжваюць экспедыцыі ў нар. асяроддзе, запісваюць нар. песні, вусна-паэт. творы, вывучаюць жыццёвы ўклад канкрэтнай мясцовасці, пераймаюць майстэрства выкання ад вопытных нар. спевакоў, казачнікаў, танцораў, майстроў па вырабе нар. адзення, прадметаў дэкар.-прыкладнога мастацтва і інш. Гэта праца патрабуе шмат часу і намаганняў. Напр., каб вывучыць нар. манеру спеваў, нават прафесіяналам-выканаўцам (Д.Пакроўскі, Н.Мяшко) спатрэбілася шмат гадоў. Выканаўцамі Д.ф. з'яўляюцца работнікі культуры і адукацыі, урачы, настаўнікі, рабочыя, студэнты, вучні старэйшых класаў і інш. Яны адчуваюць шчырае жаданне, духоўную патрэбнасць вывучаць традыц. культуру, усведамляюць неабходнасць супрацьстаяць уздзеянню не лепшых узораў

сучаснай поп-культуры на выхаванне моладзі. У кожным раённым цэнтры і горадзе Беларусі дзейнічаюць калектывы Д.ф. Яны арыентуюцца на канкрэтны мясцовы этнаграф. і фалькл. матэрыял, улічваюць пры яго вывучэнні асаблівасці жывой гутарковай мовы і дыялектаў, умовы бытавання, міфал. спецыфіку абрадавых дзей, распрацоўваюць формы і метады іх узнаўлення ў сцэнічных умовах. На жаль, не ўсе прадстаўнікі калектываў усведамляюць змест і сэнс паняцця «Д.ф.». Яны лічаць, што выконваюць аўтэнтычны фальклор, у той час як яго выканаўцы з'яўляюцца носьбітамі традыцый, а ўдзельнікі Д.ф. такімі не выступаюць. Яны вывучаюць спадчыну ў другасных формах, пераймаюць яе ад знаўцаў аўтэнтыкі. Выкананне аўтэнтычных форм у Д.ф. сведчыць аб высокім прафес. падыходзе і адказнасці тых, хто жадае пераняць, прадоўжыць жыццё фалькл. твораў, якія знікаюць ці зніклі з нар. побыту, захоўваюцца пераважна ў памяці носьбітаў традыцыі. Д.ф. з'яўляецца найб. перспектыўным кірункам захавання і засваення традыц. спадчыны ў новых сац. умовах жыцця грамадства, калі ў творчай дзейнасці атрымлівае ўсё большае развіццё фальклярызм — складаны, супярэчлівы працэс выкарыстання фальклору ў розных галінах культуры. Таму Д.ф. патрабуе ад тых, хто ім займаецца, акрамя практыкі, засваення тэарэт. ведаў па этнаграфіі, фалькалоры, мастацтвазнаўстве і інш.

*Літ.*: Аляхновіч А.М. Народная песня ў мастацкай самадзейнасці. Мінск, 1991; Яго ж. Беларуская традыцыйная музычная спадчына. Мінск, 2000.

*А.М.Аляхновіч.*

**ДРУГА́Я БЕЛАРУ́СКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ТРУ́ПА**, назва *Беларускага трэцяга дзяржаўнага тэатра* ў 1924—26.

**«ДРУГА́Я ПРАМО́ВА РУСІ́НА АБ НАРАДЖЭ́ННІ ХРЫСТА́»** [Ulia Concio Buthena pro Nativitate Oni Domini], ананімны парадыйна-сатырычны твор беларускай л-ры. Узнік прыкладна ў 1-й чвэрці 18 ст. Змешчаны ў рукапісным зборніку 1-й пал. 18 ст., які напісаны ў 1711—1741 на лац., бел. і польск. мовах. Знойдзены ў Вільні ў 20 ст. Сама прамова напісана на бел. лацінцы, цытаты з рэліг. л-ры пададзены на лац. мове, сустракаецца польск. і рус. лексіка. Твор носіць антыклерыкальны характар і пабудаваны па ўсіх канонах царк. казання з адпаведным эпіграфам Евангелля ад Лукі: «І вернуцца пастыры». Выбраўшы традыц. рэліг. сюжэт (ваўкі — авечкі — пастыры), аўтар напаўняе яго актуальным зместам. Атрымоўваецца, што пастве трэба баяцца не столькі ваўкоў, колькі жаўнераў, якія рабуюць усё, што трапляецца на іх шляху. У твор арганічна ўваходзіць бел. інтэрмедыя, у якой дзейнічаюць мужык Васіль і яго парабак Селівон. Падобнымі сюжэтамі карысталася зах.-еўрап. драматургія, дзе паны пераапраналі селяніна ў сваё адзенне і пацяшаліся над ім. У бел. інтэрмедыі парабак становіцца панам над сваім гаспадаром і прымушае яго працаваць. Аўтар глыбока пранікся вусна-паэт. творчасцю бел. народа, якая выяўляла спрадвечную мару народа вызваліцца ад улады багатых. Камічны эфект дасягаецца спалучэннем «высокай» біблейскай тэмы з апісаннем бытавых сцэн простай гутарковай мовай. У творы праявіліся асветніцкія ідэі — рэліг. вальнадумства і парадаксальнасць, антыклерыкалізм.

*Публ.*: Прамова русіна аб нараджэнні Хрыста // Полымя. 1965. № 9. *У.І.Каяла.*

**ДРУГІ́ ДЗЯРЖА́ЎНЫ РУ́СКІ ТЭА́ТР БЕЛАРУ́СІ**, гл. *Гомельскі абласны рускі драматычны тэатр.*

**ДРУГІ́ ПАКАЗА́ЛЬНЫ ТЭА́ТР**, Другі чырвонаармейскі паказальны тэатр пры палітаддзеле 16-й арміі Заходняга фронту. Існаваў з восені 1920 да ліп. 1921. Сфарміраваны ў Бабруйску з акцёраў Петраградскага нар. дома, рус. труп і ўдзельнікаў аматарскага мастацтва. Меў філіял у авіятрадзе «Ілья Мурамец». Начальнік тэатра акцёр-аматар С.Бахрах, рэж. А.Пакрасаў-Гяцэвіч. У рэпертуары пераважала рус. класічная драматургія, агітацыйныя п'есы і канцэрты. Сярод пастановак: «Вяселле Крачынскага» А.Сухаво-Кабыліна, «Без віны вінаватыя», «Апошняя ахвяра», «Беднасць — не загана», «Беспасажніца» А.Астроўскага, «Горкі лёс» А.Пісемскага, «Павел I» Д.Мераэжкоўскага, «Гора ад розуму» А.Грыбаедава, «Жывы труп» Л.Талстога, «Барыс Гадуноў» А.Пушкіна, «Дні нашага жыцця» Л.Андрэева, «Рэвізор» і «Жаніцьба» М.Гогаля, «На дне» М.Горкага, «Каралеўскі цырульнік» А.Луначарскага, «Патанулы звон» Г.Гаўптмана, «Пакаранне смерцю» Р.Ге, «Атэла» У.Шэкспіра, агітацыйныя «Баявыя сокалы», «Апошні якабінец». У трупе тэатра налічвалася каля 80 чал., у т.л. акцёры Б.Быхоўскі, М.Дняпроў, К.Замешына, В.Зярноў, К.Кулакоў, Б.Нявролін, У.Фарасаў. Тут пачыналі творчую дзейнасць рэж. В.Барысевіч, артыст У.Уладамірскі, кампазітар Я.Цікоцкі. Вясной 1921 тэатр рэарганізаваны і перададзены палітупраўленню Зах. фронту. Неўзабаве расфарміраваны.

**ДРУ́ЕЎСКАЯ ГЕО́РГІЕЎСКАЯ ЦАРКВА́**, помнік драўлянага дойлідства ў пас. Друя Браслаўскага р-на. Пабудавана ў 19 ст. на цокалі з бутавага каменю. Да асн. прамавугольнага ў плане аб'ёму прымыкаюць нізкі бабінец і 5-гранная апсіда. Асн. аб'ём накрыты 2-схільным дахам з цыбулепадобнай

*Друеўская Георгіеўская царква.*

